індывідуальнасць непасрэдна ўзрастае, уздымаецца з агульных светапоглядных пачаткаў, непарыўна звязана з архетыпамі народнага мастацкага ўспрымання.

Для Танка як мастака слова ўласцівы ў вялікай ступені дар пераўвасаблення. А гэта азначае, што для яго паэзіі характэрныя не толькі лірычнае выражэнне, але і эпічная аб'ектывізацыя, і нават драматычная рэпрэзентатыўнасць.

Мастацкі свет Максіма Танка шматмерны, велічны, універсальны. Такі ж універсальны, шматпланавы і чалавек, які знаходзіцца ў цэнтры гэтага свету.

*І. М. Гойзіч*

## АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА І ЯНКІ СІПАКОВА

У творчасці сапраўдных мастакоў слова, якімі, бясспрэчна, з'яўляюцца Максім Танк і Янка Сіпакоў, абавязкова прысутнічаюць вершы пра агульначалавечае, напісаныя для ўсіх нашчадкаў і на ўсе вякі. У такіх творах паэты выходзяць на маштабна-абагулены аналіз і разгляд жыцця чалавека і прыроды ў «касмічным» плане, у святле вечных праблем жыцця і смерці, узаемаадносін чалавека з грамадствам і прыродай праз паказ глыбокіх і шматгранных сувязей рэчаў, прадметаў, з'яў, праз пошук ісціны, што палягае ў памежжы Дабра і Зла, Жыцця і Смерці, Любові і Нянавісці.

Здаецца, як можна ставіць побач гэтых двух таленавітых паэтаў, пачатак творчасці якіх падзяляюць тры дзесяцігоддзі? Каб адказаць на гэтае, на першы погляд, нескладанае пытанне, звернемся да аналізу эстэтычных і маральна-філасофскіх каштоўнасцей, «закладзеных» у творах абодвух мастакоў.

Агульначалавечыя і нацыянальныя па змесце, адточаныя, філігранныя па форме лепшыя творы Максіма Танка перажылі, а Янкі Сіпакова, несумненна, перажывуць «малы час» і, падобна промням, пашлюць квантавую энергію святла ў «час вялікі» (М.Бахцін). Аднак для доказнасці выказанай зыходнай думкі звернемся да канкрэтыкі, выкарыстаем прыём тыпалагічнага параўнання.

Думка пра самавызначэнне беларускай супольнасці як раўнапраўнай, годнай нацыі з багатай мінуўшчынай, з магутнымі каранямі, а не нацыі рабоў, усведамленне важнасці фактару захавання спадчыны для невялікага народа, які жыве сярод больш магутных суседзяў, прасякае ўсю танкаўскую творчасць (як раннюю, так і познюю) і большасць вершаў Янкі Сіпакова. Радзіма для абодвух паэтаў — адзіны скарб, і ў большасці выпадкаў любоў да яе выказана нібы сцішана, сумна-пранізліва. «Прызнавацца Радзіме ў сваёй любові да яе трэба ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам — такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях»,— піша Янка Сіпакоў. Любоў да вялікага ў паэта-шасцідзесятніка звязана з захапленнем звычайнымі праявамі жыцця: промнем і зоркай, бліскавіцай, сакаўным яблыкам і кропелькай расы, травінкай і духмяным лісцем.

Абодва мастакі слова выразна ўсведамляюць цяжкасць сцежак жыццёвых, лёсу Беларусі і папярэджваюць будучыя пакаленні, што можа стацца з тым народам, які адрачэцца ад сваёй мовы, гісторыі, памяці продкаў. У танкаўскім вершы «Родная

мова» чытаем:

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.

Не менш пераканальныя і сугучныя радкі і ў вершы «Роднае слова» Янкі Сіпакова:

Цябе забаранялі, быццам свята,
Нібы злачынцу зацiскалі рот.
А ты і з-за выкрэсленняў,
нібы з-за кратаў,
Глядзела на знямелы свой народ.

Вера ў матчыну мову, у яе ачышчальную сілу з'яўляецца адной з дамінант стылю абодвух паэтаў. Нават у сваіх публіцыстычных нататках творцы не раз звяртаюцца да гэтай складанай праблемы — праблемы захавання каранёў як асновы чалавечай духоўнасці, годнасці, вартасці.

Максім Танк даволі часта звяртаецца да біблейскай тэматыкі, да запаведзяў, што пакінуў нам Бог: «Здавалася, што на ўсё жыццё хопіць // У мяне расплачвацца: // За дабро — дабром, // За забыццё — памяццю, // За абыякаасць — цеплынёй, // За жорсткасць — ласкай». Асабліва ў апошнія гады свайго жыцця ён успамінае даўнія запаветы, якія выпрацаваліся і сфарміраваліся пад уплывам агульначалавечай маралі, прайшлі выпрабаванні часам.

З даўніх запаведзяў сёння
Паўтараю я нязменна:
Ратуй, божа, ад вар'яцтва,
Нематы і засляплення,
Ад пярэваратняў, зныдняў,
Ханжаскіх богаслужэнняў.
Пошасці, вайны, бясхлеб'я,
Нашых душ апусташэння.

Паэты — прадстаўнікі розных пакаленняў — не толькі ўдала выкарыстоўваюць у сваёй медытатыўнай лірыцы міфалагемы, але і выходзяць на прытчападобнасць як спосаб, форму перадачы вострага адчування трагізму жыцця, прадчування катастрофы, напружанасці і нетрываласці чалавечага быцця: вершы са зборніка Максіма Танка «Errata», ужо працытаваны «Одзіум» Янкі Сіпакова, яго ж шматлікія прытчы, вершы. На раскрыццё гэтай ідэі працуе сімвалічны, а падчас і алегарычны прыём пісьма двух мастакоў слова, іх паэзія поўніцца шматлікімі вобразамі-сімваламі, некаторыя з якіх з'яўляюцца скразнымі.

Янка Сіпакоў, як і Максім Танк, змог у лепшых сваіх творах дасягнуць гарманічнай раўнавагі, сінтэзу-роздуму і балючага пачуцця, аднак у многіх медытацыях паэта рацыянальнае пераважае над эмацыянальным. На першым месцы ў іх знаходзяцца не апісанне і пачуццёвае сузіранне, а думка і разважанне. Аснову падобнага «іншабыцця ў слове» складае роздум, думка, унутраная палемічнасць, дзякуючы чаму вершы набываюць адзнакі медытатыўнай лірыкі. У іх выяўляюцца засяроджанасць на самых складаных праблемах чалавечага быцця, псіхалагізм і аналітызм.

Кожны паэт — сын свайго часу і сваёй зямлі. Зямля ў Максіма Танка і Янкі Сіпакова адна — Беларусь, з яе непаўторна-дзівосным багаццем фарбаў і гукаў. Гэта

крыніца яскравай вобразнасці, нечаканай асацыятыўнасці, міфалагічнасці, нацыянальнай адметнасці творчасці паэтаў. Час унёс свае карэктывы ў фарміраванне духоўнага і грамадскага аблічча двух мастакоў. Янка Сіпакоў ішоў ад светлай улюбёнасці ў свет з адзнакамі лёгкага суму («…адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?») да такога ж самага, як і ў Максіма Танка, расчаравання і адчування трагедыйнасці, разлому жыцця.

Максім Танк і Янка Сіпакоў — арыгінальныя мастакі, якія шукаюць прамежкавыя жанравыя формы для перадачы складаных перажыванняў і з'яў, прыхільна ставяцца да свабоднай манеры пісьма, спалучаюць прыёмы класічных родаў літаратуры. Падобная родавая і жанравая свабода паэтаў, магчыма, з'яўляецца працягам даўняй традыцыі дэмакратызацыі літаратуры, выхаду яе непасрэдна на адкрытую размову з чытачом. Такім чынам, Янка Сіпакоў ідзе ў літаратуры ў многім «Танкавым» шляхам: шляхам канцэнтрацыі думак, пачуццяў, сэнсу ў творах, сінтэзу традыцыйнага і наватарскага, выяўлення на малой плошчы шматзначнага, яскравага, характэрнага. Шырыня «мыслення вершамі» (у сучасным слоўным мастацтве такая з'ява назіраецца вельмі часта) у абодвух мастакоў выклікае да жыцця і адпаведную сінтэтычную вобразнасць, стылявую ўскладненасць, «шматслойнасць» пісьма.

*Т. К. Грамадчанка*

## ФІЛАСОФСКІЯ АСПЕКТЫ ЛІРЫКІ МАКСІМА ТАНКА І АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

На пачатку XX стагоддзя маладая беларуская літаратура творамі М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Гарэцкага загаварыла не толькі пра цяжкае прыніжанае жыццё народа, але і пра быційныя праблемы. Дзесяцігоддзем пазней гэту гаворку працягнулі У.Жылка, У.Дубоўка, К.Чорны, Н.Арсеннева... Адметнае месца ў выяўленні светабачання беларуса належыць Максіму Танку і Аркадзю Куляшову, найярчэйшым творчым індывідуальнасцям у нацыянальнай паэзіі сярэдзіны XX стагоддзя.

Наша літаратуразнаўчая навука не ставіла побач гэтых пісьменнікаў, прызнаючы тым самым выключную самабытнасць іх мастацкіх светаў. Непадобнасць М.Танка і А.Куляшова, паэтаў-равеснікаў, амаль аднагодкаў, закладзена ўжо месцам нараджэння: Усход і Захад, сялянская сям'я і сям'я вясковых інтэлігентаў-настаўнікаў. Так, заходнебеларуская рэчаіснасць многае абумовіла ў станаўленні светапогляду М.Танка, як савецкая (усходнебеларуская) — А.Куляшова. Маюцца на ўвазе не палітычныя ідэалы, а творчая арыентацыя.

Прайшоўшы ў дзяцінстве праз захапленне рускай класікай, М.Танк у 1930-я гады звярнуўся да вопыту заходнееўрапейскіх літаратур. Яго цікавілі найперш мадэрнісцкія напрамкі, што сцвердзілі сябе побач з рэалізмам у канцы XIX — пачатку XX стагоддзя ў Францыі, Англіі, Нарвегіі, Польшчы і іншых краінах Еўропы. Павага да мастацкага эксперыменту, аднак, не перашкодзіла М.Танку ўбачыць, што «на Захадзе нараджаецца нейкая паэзія без Радзімы» («Лісткі календара»). Апошні момант — сувязь з роднай зямлёй, радзімай — найгалоўнейшы ў творчасці паэта.